БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да д му у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвест к:
за в рш этыту на 1-й тра і у на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 11. Менск. Пятніца 5 красавіка 1918 г. Год I

Менск 5/IV.

Гасьцінец матцэ.

На Заходзе, нідаўна пачаўшыся, ідзець, здаецца, астатняя бітва. Доля нэйтральных дзержаваў і малых народаў—на канцу мечa гэтай страшэннай змогі двух супраціўных старон, узяўшых на сябе цяжкі абавязак кінуўшы на сьмерць тысячы людзей перамагчы адна другую і адкрыць на гэтым шырокую дарогу для нацыянальнай творчасьці.

Нямоччына, Англія, Францыя, ў якіх пачуццё нацыянальнай самаабароны стаіць высока, маюць аб'едныныя у адну сямью народы, дзе кожны грамадзянін шчасьцие народу ставіць выжэй сваго жыцця.

Для жыцелёў быўшай толькі Імпэрыі,а ні нацыянальнаго государства, нацыянальнае учуцце было неразумела, як бы чацьверты номер у матэматыцэ. Толькі у акраінных народаў нацыянальная ідэя заусягды гарэла маленькім агеньком; гэты аганек німаглі загасіць ніякімі способамі.

Цяпер Беларусы загарэліся агнем каханьня да сваей нешчастнай Бацькоўшчыны. Расчараньне ад вайны і фронту, калі палавіна людзей была выгнана з родных хат, на чужыну паказала што мы страцілі тое, што ні цэнілі раней родны край.

Беларусь раздзелена, разбурэна, разарвана па кавалкі і толькі моцны беларускі нацыянальны звязак і праца творчых сіл можа адбудаваць адну нідзялімую Беларусь.

Што дзень распець сьвядомая семья беларусоў, бо душу ахватывае абавязак быць карыстным роднай зямле.

Усе зьезды вынасілі рэзалюцыі, каб усе фронтавое дабро было перэдана пабуранаму нашаму краю.

Недзе у далекай чужой Румынії адзін корпус быў абеларушчаны.

Гэтаго дабіуся зьезд беларусоў воіноў,—яны хацелі памагчы свэей далекай Бацькоўшчыне, як годныя яе сыны.

Спакой у Брэсці дэмабілізаваў гэты корпус, але усе меня вайсковае складалі у склады, бо,—гэта уласнасць Беларусі, можэ ей яшчэ спатрэбіцца на што,— казалі беларускія воіны.

Што робіцца у Менску яны ні ведалі, большэвіцкі хаос закрыў усе туманам.

Прыйшла ужо ранняя палудзенная весна, а жменя людзей, астаўшыхся ад «беларускаго корпуса», палугалодная сядзяць і пільнуюць беларускі скарб, на далекай чужыне, але пакуль чужынцы румыны ні узялі і на сябе пад канец апеку, над войскавым дабром ніведамой ім, лежачэй негдзе далека, Беларускай Рэспублікі...

Гэтак дзеці зямлі Беларускай прыгатавалі ей свой гасьцінец!

— Стары, заглўшаны дух дзержаўнасьці прабудзіўся і ужо ні засьнець.

З развязанымі рукамі.

Тамака, куды дадзенне у 2 гадзіны адходзінь поезд з Менска, ва ўсе іпчэ вялікай і ніаб'ятнай Расіі кішаць тысячы мурашнікаў.

Нічым ні зьвязаныя с астрыжэнам дзержавы, капошуцца самаазначыўшые сябе гарады, воласьці, нават вёскі. Тысячы спрэчных прычынаў нацыянальнаго, эканамічнаго, рэлігійнаго і інш. сэнсу раздрабляюць на кавалачкі былую «вотчыну» рускіх цароў Яшчэ больш прычынаў прафэссіанальнаго, партыйнаго, ў канцы прыватнаго інтэрэсу робяць гэты падзел драбнейшым і глыбейшым. А над гэтым сьветам усякае рожнасьці і посіпца сеючы помсту і злосьць дух расійскаго цэнтралізма ў кшталце «савецкай» ўлады.

Ваюючы з выглядуючым ад усюль «ўнутраным фронтам», большэвізм аднак ні траціць веру у сябе. І нават. так прынамсі здаеца чытаючы савецкія «Ізвесція», пачувае сябе шмат спакайнейшым чым-ся месяц тамy назад.

Бярэсьцейская мірная умова, разам з «дэмобілізацыяй» нічого ні вартай арміі развязала большэвіком рукі. Аддзяленне значнай часьці краёў быўшай імпэрыі пазваляе сконцэтраваць сілы для астатняго націску на «хатніх ворагаў» і для арганізацыі новаго парадку.

І ні гледзячы на тое, што «справа социяльнай рэвалюцыі» далека іпчэ ні скончана у голасе большэвікоў прачуваюцца ужо гордыя ноткі пабеды, «Савецкая ўлада, піша рэдактар Нахамкес у № 55—«Ізвесьцій», гэта апошняе слова рускай рэволюцыі зробленай у лета ад Нараджэння Хрыста 1917-е Ніякай сілы, здольнай скінуць і замяніць яе другою, у расійскім посполь-стве німа... Савецкай уладзе, якія-б яна абмылкі, дзеля навізны наступленых ей заданняў ні рабіла, суджана доўга жыць. ...Яна ні толькі ні сказала іпчэ сваёго апошняго слова, але наадварот, толькі цяпер пачала пушчаць глыбокія карэння па усёй дзержаві, да самых глухіх закуткаў. Дзеля гэтаго ў долі яе мы пэўны і верым у яе добрую ўдачу».

Падаваныя у большэвіцкім афіцыозе факты даюць нібы грунт для такого гордаго пачуцця. «Саветы» абзнаеміліся крыху з жыццем і пачалі шырокую, па дзержаўны лад, арганізацыйную работу. Нацыяналізуюцца прэдпрыемства і банкі стваруюцца праэкты разумнай сельскай гаспадаркі на адабраных ад землеўласьнікаў грунтах, да працы, «по стольку—поскольку» запрашаецца інтэлігэнцыя і як вянец усяму творыцца чырвоная армія з добравольцаў,

Што важней, большэвікі пазналі патрэбнасьць парадку і дысцыпліны як у арміі так і ва ўсякай працы і як відаць маняцца праводзінь іх ні адступаючы нават перад прымусам над самімі «таварышамі».

Але гэта усё толькі нібы-то грунт. На праўдзі-же становішчо „савецкай» ўлады надта ціпаўнае. Усё шчасьце большэвікоў у тым, што Расія была некалі «ад акіяну да акіяну». Дзякуючы толькі гэтаму яны будуць іпчэ нейкі час трымацца. Але абцінанне фалдаў даўнейшай Расійскай дзержавы толькі іпчэ пачалося і німа ведама на чым стане, калі толькі і у быўшых хаўрусьнікаў Рассіі развяжуцца рукі. Трэба думаць, што хаўрусьнікі памогуць «самаазначыцца» народам Сыбіру, Туркестана, Урала і Прыуралья і тады што станецца з большэвіцкай Вялікаросіей?—Сама без усякай чужой помачы, яна павінна бўдзя задыхнуцца ад галэчы, калі іпчэ раней, пакорна схіліўшы голаў, ні пакліча сабе «варагоў» з Раманаўскаго, пэўне, дому.

І большэвіцкі плян адраджэння мае ў сабе адзін варунак, які зверне массы проціў і, нават Вялікаросії. Гэта—патрэба дысцыпліны і парадку. Тутака яны зьбяруць тое, што сеялі. Як толькі дзела прыдзе да парадку рэспушчаная масса звярнецца проціў іх с чым скончыцца і іх панаванце.

Такім чынам згінуць і гэтыя вoi Рускаго вялікадзержаўнаго цэнтралізму, а разам з імі і абрыдлая мачыха усіх заціснаных у жмені яе народау Вялікая—ад акіяну да акіяну—«Мать—Расея».

Па краю.

З Вільні.

(ТЭАТР).

Таварыство «Золак» якое прыносіць шмат карысьці грамадзянству сваёй апекай над дзецьмі, уладзіла у серэду 27 сакавіка дзяціннуую выставу. Больш 40 дзяцей аднаго с прытулкаў паказвалі беларускую містэрыю, апрацованую па старым тэкстам паняю Станіславаю Корф. Містэрыя складаецца с трох часьцей. У пер-

шай часьці паказаны мінулыя народныя легенды і паданя. Канчаецца зіма. Славяне высьмеіваюць яе саломяны візарўнак і потым выкідаюць. Сьветлую вясну, якая свой вянак с кватак прыносіць у афяры агню, вітаюць радаснымі песьнямі. Потым дзед-жабрак разносіць паўсюдах вестку людзям аб прыходзе Хрыста, катораго спатыкаюць глыбокай верай, падаючы на калені. Дзьве апошнія часьці «У садзе» [«У агройцу», як чамусьці было надрукавана у програме] і «У Пілата» аспаваны на апавесьцях Эвангелістаў. Дзеці артысты палажылі відаць шмат старання каб Містэрыя зрабіла добрае уражэнне. Асабліва удаліся песьні і карагоды 1-й часьці.

Публіка асталася надта здаволенай.

Мусім падзякаваць пані Ст. Корф. апрацаваўшай Містэрыі для выставаў, за зроблены ёю ўклад у Беларускую Культуру.

N—о.

З Украіны.

Праграма новага габінэту міністраў.

Добрасуседскія стасункі да ўсіх дзержаваў; стараньне аб прызнаньні усімі дзержавамі незалежнасьці Украіны, мірная мова з Расіяй, перагаворы з Румыніяй і перамога усіх лопатаў, перад якімі знаходзіцца Украінскі Урад будуць важнейшымі заданнямі палітыкі Украіны. У ўнутранай палітыцэ патрэбна найперш усталяўленне парадку на Украіне, стварэнне асобнай міліцыі захаванне усіх заваяваных рэвалюцыяй вольнасьцяў. Ваеннае міністэрства створыць армію пераходную да народнай міліцыі. Рэгулярная армія арганізуецца на дэмократычных прынцыпах. У заграпічным гандлю будзя праводзіцца прынцып дзержаўнай манаполіі ці дзержаўнага кантролю; ва ўнутраным гандлю дапушчэнне прыватнай ініцыятывы і найболей шырокае прыцягванне таварыстваў. Жалезныя дарогі залічаюцца дзержаўным менем п… захаванні прыватнай ініцыатывы. Почта і тэлеграф павінны ў найхутчэйшым часе пачаць зносіны с заграніцай. Радіотэлеграф пераходзіць да гасударства. Міністэрства агульнай апекі пры спаўпрацы упоўнамочных павінна даставіць украінскім гарадам і районам патрэбныя прадукты і памагаць разьвіццю гандлю. Аграрная рэформа будзя праводзіцца аграрнымі камітэтамі новай арганізацыі. Украінскі габінэт міністраў створыць асобныя камісіі для зьбірання лішкі жыта, фуражу і інш. прод. Камісіі на аснове урадовых данных лішкі і нідастаткі і зробіць падрахунак.

(Berlin. Lokal Anz.).

Агульныя вестхі.

(Павэдлуг нямецкіх газэт).

БЭРЛІН 30/III. Глаунакамандуючы Макензэн паведамляе, что паміж цэнтральнымі дзержавамі і румынскім урадам 23 сакавіка 1918 году зроблена умова, аб абмене палоннымі. Нямецкія палоныя павінны былі 29 і 30 сакавіка быць адпушчаннымі румынскім урадам.

Палонным трэба будзя атбыца 23 дні у карантынным абозе у Букарэшці.

БЭРЛІН 1 г. м. Французскі урад пастанавіу здаволіць жычэнне Злучэных Штатау каб амэрыканскія войскі выступалі разам з ангельскімі і французскімі на рауніне у Пікардыі.

ПАРЫЖ 31/III. Генэрал Фош назначэн генэралісімусам заходняго фронту. Яму даручана аб'еднанне чынкасьці коаліцыйных арміяу на заходнім фронце.

ПАРЫЖ 31/III 30 сакавіка нямецкая дальнабойная армата астрэлівала аколіцы Парыжа. 8 асоб забіто і 37 асоб ранено).

ПАРЫЖ 2 г. м. Пры далейшым абстрэлі Парыжа з дальнабойнай арматы 31/III забіты 1, зранены 1. Пры абстрэлі у панядзелак у Парыжу забіто 4, зранено 9.

ПАРЫЖ 29/III. Палата дэпутатау прыняла закон аб прызыве новобранцау 1919 г.

ЛОНДАН 1 г. м. Ллойд-Джорж звярнууся да прэмьер-міністрау Канады, Аустраліі, палудзенной Афрыкі, Новай Зэландіі і Нью-Фандленду с тэлеграмай, у якой кажучы аб канечнасьці узмацавання войска вымагае ад урадау гэтых краеу якнайбарджэйшаго узмацавання іх контінгэнтау, дзеля таго, што у бітву павінна быць кінуто усе да астатняго чалавека.

ЖЭНЭВА 1 г. м. Ад быушаго на прошлым тыдні абстрэлу пацярпеу моцна Дюнкірк. Найгорш пацярпела портовая часьць.

Знішчэння зробленныя абстрэлам Парыжу у апошнія 48 гадзін перавышаюць прычыненыя раней. Людзі абедаюць на станцыях падз. жал. дарог.

ЖЭНЭВА 2 г. м. Міністр фінансау Клотц зрабіу паведамленне французскай палаце дэпутатау, што трэба быць гатовымі да адступлення французскай арміі ад Монтідіэр, для заняцця выгаднейшых пазыцыяу, што, канечне, будзя зроблена у парадку. С Компьену, Аррассу і Амьену нібыто выехалі усе цывільныя жыхары.

МАСКВА 1 г. м. Глаунакамандуючы савецкімі вайскамі на Украіне паведамляе ад 29 сакавіка, што глауныя большэвіцкія сілы падаліся на р. Ворсклу. Палтава занята войскамі Рады, каторыя маюць нямецкую цяжкую артылерыю. Большэвікі знішчылі масты і запасныя склады. 29 сак. яны ішчэ трымалі за сабой ж. д. станцыю.

МАСКВА 1 г. м. 31/III прыбылі у Петраград с Фінляндіі пасланікі французскі, сэрбскі і італьянскі. На запытанне як адносіцца коаліцыя да Рассіі, французскі пасланік Нуланс атказау: атказам служыць факт што мы астаемся у Расіі.

СТАКГОЛЬМ 29/III. На вестку, што японцы пацярпелі у бітве з большэвікамі і павінны былі адступіць ад Благавешчэнску за Амур, у Тэйгайтэру злажыуся дабравольны японскі корпус каторы пасьпешае ужо у кірунку Благоешчэнска.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

У гарадзкім крэдытным т-ве у хуткім часе адбудзіцца агульны гадавы сход, на каторы рыхтуецца даклад. Паміж іншым у дакладзі будзе з'вернута увага, што хоць гарадск. крэд. т-во, дзякуючы вайне, і ні дае даходу, але усе ж ткі як інстытуцыя самая паважная, з'яуляецца крэдытным «сэрцам і пульсам» нашаго места.

На сходзе адбудуцца выбары праулення замест чарадных выбываючых: дырэктара—Свенціцкаго, членау камітэту—Валовіча і Крэйнэса і ацэншчыка—Пітенцова.

Гарадзкое таварыство узаемнайстрахоуні адпажарау пякуць даклад на агульны гадавы сход, які маніцца быть у палове красавіка.

Трэба прызнацца, што у управленне і у «наблюдацельны камітэт» людзі праціскаліся рожнымі способамі, дык, само сабой, баранілі інтарэсы тых, хто ім памагау праціснуцца, а ні тэй большасьці з якой складаецца таварыство: дробных домауласьнікау, на краі гораду, арэндароу рамеслянікау—фахауцоу, вошчыкау і т. п., а меншая частка—гарадзкая буржуазія.

На агульных сходах шыло вылазіло з меху—пачыналіся споркі, успаміналіся крыуды і канчалася.. праз лад шумна.

Трэба спадзевацца, што у цяперашнім часе, пры цяперашніх варунках сход пройдзе інакш: будзе выслуханы голас тых, хто у гэтай справе найбольш зацікауляны, і чые інтарэсы найбольш пакрыуджаны.

Харчовая камісія Л.-Р. ж. д. з начальнікам харчовай часьці п. Прэбражэнскім 31-га сакавіка выехала за згодай нямецкаго начальства на Украіну па харчы жалезнадарожнікам. Камісіі дадзен асобны вагон на Кіев, Палтаву і далей, апрача выданы сьвядэцтва ад дарогі і нямецкаго начальства на права свабоднай закупкі харчоу, іх правозу і абароны ад рэквізыціі.

У афіцэрскім бюро сягодня—5-го красавіка павінна быць скончана рэгістрація усіх сямейных афіцэрау, жывучых разам с сваім сямействам, а таксама ураджэнцау Польшчы, Літвы і Прыбальтыцкаго краю. Афіцерау, маючых сабе службу, рэгістрацыя вядзецца асобна.

Справы Усерасійскаго Земскаго Саюзу—не палепшаюцца: каля трох месяцоу быушые служачые абіваюць парогі рожных камітэтау, і нічога выбіць ня могуць.

Самае цяжкое палажэнне з мэдыцынскім аддзелам: ні горад, ні земство ні могуць прыняць на сябе утрыманне шпіталеу. Губэрнскае земство маніцца перагаварыць аб гэтай справе з нямецкім начальствам.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 4 красавіка 1918 року.

ЗАХАД:

На баевым фронце ажывілася баевая дзеячнасьць на поудзень ад Соммы.

Рано наранку і у вечары непрыяцель чатэры разы ніспадзевано і пасьля моцнай артылерыйскай падгатоукі маніуся зноу зауладаць забранымі у яго высотамі на поудня—захад ад Морейль. С цяжкімі для ніпрыяцеля стратамі атакі адбіты.

Каля Вердэна і на поунач ад Паррайскаго лесу на шмат участкоу рухавы артылерыйскі бой.

УСХОД:

У згодзі с Фінляндскім Урадам нямецкае войско высадзілася на Фінлядскім беразі.

На другіх фронтах нічога новаго.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар
фон-Людэндорф.

Спіскі патрабнейшых продуктоу для штодзеннаго жыцця, колькі хто мае іх у запасе—15-го красавіка павінны быць—па праекту нямецкаго начальства—предстаулены усімі жыхарамі нашаго гораду. Колькі чаго можна будзе мець у запасе ішчэ ні саусім вядома, бо аб гэтым ідуць перагаворы паміж немцамі і Гар. Думай, але што шмат каму, асабліва з багацейшых, падрэжуць фалды і полы—то гэта пэуна.

Рэдактар А. Прушынскі.
Выдавецтва Т-во «Заранка».

Друкарня Я. А. Гринблюма.